# Класік. Волат. Чалавек

14.08.2017 17:24 **Аўтар:Марыя Асіпенка**

**Ці ведаеце вы, што народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль пачынаў як паэт? Ці можаце ўявіць, як уважліва ён ставіўся да распрацоўкі сюжэтаў сваіх празаічных твораў?.. Ці разумееце, якія мары меў?..**



Пра гэта ішла гаворка на вечарыне, прысвечанай стагоддзю Янкі Брыля ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», дзе сабраліся сябры, калегі, даследчыкі і аматары яго творчасці. На запрашэнне газеты «Літаратура і мастацтва», якая разам з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва арганізавала вечарыну, адгукнуліся яго дзеці: дочкі Наталля, Галіна і сын Андрэй.



Нават іх увагу прыцягнулі архіўныя дакументы, сярод якіх партрэт жонкі Ніны Міхайлаўны, намаляваны братам пісьменніка і дасланы яму ў нямецкі палон. Лісты, напісаныя пад лінеечку дзецьмі, якія засумавалі без таты: вандроўкі Брыля адлюстраваны ў фотаздымках, і іншыя дакументы праўстаўлены на выстаўцы, што працягвае працаваць у памяшканні Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Тут захоўваецца даволі важкі фонд пісьменніка: каля 12 750 дакументаў, засведчыў кандыдат філалагічных навук Віктар Жыбуль. Ёсць і віншаванні да юбілейных дат, у тым ліку ад супрацоўнікаў «ЛіМа» — Янка Брыль быў актыўным аўтарам газеты.



— Іван Антонавіч — волат нашай літаратуры, пісьменнік-інтэлектуал, сумленне нацыі, — адзначыў дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Іван Саверчанка. — Ён адлюстраваў шмат якія трагічныя аспекты XX стагоддзя. Цяпер задача нашага інстытута — падрыхтоўка збору твораў Янкі Брыля, згодна з дзяржаўнай праграмай.



Першы том збору павінен выйсці на працягу года. Дадаткам да яго можа быць збор успамінаў пра пісьменніка, якімі ёсць каму падзяліцца:




— Калі я першы раз убачыў Брыля на семінары маладых літаратараў, гэта быў класік, якога вывучаюць у школе. І гэты вялікі чалавек і пісьменнік правёў з намі два сонечныя дні ў Полацку і Наваполацку. Ён прысутнічаў на пасяджэнні нашага літаб’яднання, разглядаў нашы творы. Адзін з самых дарагіх здымкаў у маім жыцці, дзе побач з намі, маладымі, сядзіць Янка Брыль, — прызнаўся пісьменнік Навум Гальпяровіч.

— Янка Брыль чакаў Беларусь, пра якую марыў Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, — адзначыў паэт Віктар Шніп. — Нам трэба зрабіць тое, на што яны спадзяваліся

**Марыя АСІПЕНКА**

**Фота Надзеі БУЖАН**